тенденцию ежегодного роста «горловых» часов, появления новых и несвойственных специализации кафедры предметов (например, дисциплин по программированию на кафедре математического анализа и дифференциальных уравнений), как результат, мы имеем отсутствие желания и физической, и ментальной возможности заниматься внедрением новых технологий и методик в учебный процесс. А как следствие, мы на шаг позади от ведущих университетов мира.

Поскольку лекции по-прежнему составляют большую часть учебного плана любой специальности, то совсем отказаться от традиционной формы проведения занятий с точки зрения преподавания математических дисциплин будет методически неверным шагом. Как и в любом деле, важно соблюдать меру и баланс. На наш взгляд, предпочтение надо отдать смешанному формату обучения. А для этого университету важно инвестировать в профессиональное развитие преподавателей, проводить политику финансового стимулирования работы преподавателя по созданию и внедрению в учебный процесс новых образовательных технологий и повышение качества преподавания вне зависимости от формата проведения лекционных занятий.

**Литература**

1. Активные и интерактивные образовательные технологии (формы проведения занятий) в высшей школе [Электронный ресурс] : учеб. пособие / сост. Т.Г. Мухина. – Н. Новгород : ННГАСУ, 2013. – 97с. – Режим доступа: www.nngasu.ru/education/high_education/education_manual.pdf.

2. Реутова, Е. А. Применение активных и интерактивных методов обучения в образовательном процессе вуза [Электронный ресурс] : метод. рекомендации для преподавателей Новосибир. ГАУ. – Новосибирск : НГАУ, 2012. – Режим доступа: nsau.edu.ru/file.

*УДК 378.147*
***К. С. Бабіч, Я. А. Касянок, Е. А. Кулеш***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ НАВУЧАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ ПАДЧАС РЭАЛІЗАЦЫІ СУМЕСНАЙ БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКАЙ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ “ФІЗІКА”

У 2022 годзе ў ГДУ імя Ф. Скарыны распачалася рэалізацыя сумеснай адукацыйнай праграмы з Хэцзэскім універсітэтам (г. Хэцзэ, Кітайскай Народнай Рэспубліккі (КНР) па падрыхтоўцы спецыялістаў спецыяльнасці "Фізіка". Адукацыйная праграма была ўхвалена Міністэрствам адукацыі КНР як адзін са спосабаў ажыццяўлення стратэгіі «Адзін пояс, адзін шлях» у рамках супрацоўніцтва паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь [1, 2].

Тэрмін навучання складае 4 гады і рэалізуецца па схеме падрыхтоўкі "3+1". Першыя тры гады студэнты навучаюцца на базе Хэцзэскага ўніверсітэта, пасля чаго студэнты, якія паспяхова выканалі вучэбную праграму, працягваюць навучанне на працягу 1 года ў ГДУ імя Ф. Скарыны. Выпускнікі сумеснай адукацыйнай праграмы атрымаюць дыпломы дзяржаўнага ўзору дзвюх краін.

У восеньскім семестры 2023 года для 93 студэнтаў другога года навучання пачаліся заняткі з выкладчыкамі ГДУ ім. Ф.Скарыны па асноўных дысцыплінах фізічнага профілю. Заняткі праводзіліся ў онлайн-фармаце з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ), а таксама ў офлайн-фармаце падчас стажыроўкі (малюнак 1) [3, 4].



Малюнак 1 – Лабараторныя заняткі ва ўніверсітэце Хэцзэ

Асаблівасцю выкарыстання ІКТ у онлайн-навучанні кітайскіх студэнтаў з'яўляецца немагчымасць прымянення звыклых нам кампьютарных праграм (напрыклад, Zoom і Viber) і любых web-рэсурсаў, якія выкарыстоўваюць Google-сэрвісы з-за недаступнасці іх у КНР. Дадзеная праблема вырашалася шляхам выкарыстання прыкладанняў VooV Meeting і WeChat – кітайскіх аналагаў Zoom і Viber адпаведна.

Да пераваг VooV Meeting варта аднесці адсутнасць абмежаванняў па часе на працягласць онлайн-урока, а таксама зручнейшы ў параўнанні з Zoom інтэрфейс, які прадстаўляецца лектару. Да заўважаных недахопаў дадзеных праграмы варта аднесці вялікі час (~1.5–2 гадзіны) выгрузкі файла відэа-запісу ўрока памерам каля 100МБ. Практычная рэкамендацыя па рашэнні дадзенай праблемы – сцягнуць запіс ўрока з сеткавага сховішча праграмы пазней, пасля паўторнага ўваходу. Пры спосабе тая ж аперацыя выконваецца за 5–10 хвілін.

Да пераваг мэсэнджэра WeChat варта аднесці магчымасць выкарыстання яго ў якасці сродку пераадолення моўнага бар'ера для аўтаматычнага перакладу з кітайскай мовы і наадварот, у сітуацыях не толькі акадэмічнага ўзаемадзеяння з навучэнцамі, але і ў бытавых зносінах з любым чалавекам у Кітаі. Нягледзячы на вывучэнне студэнтамі англійскай і рускай мовы, адрозненне моўных сістэм даводзіцца пераадольваць шляхам прадастаўлення студэнтам навучальных матэрыялаў загадзя для перакладу і папярэдняга знаёмства.

Пры падрыхтоўцы навучальнага курса трэба ўлічваць неабходнасць папярэдняга ўзгаднення з кітайскім бокам даступнасці праграмнага забеспячэння, якое выкарыстоўваецца ў адукацыйным працэсе. З-за абмежаванняў на заканадаўчым узроўні з высокай верагоднасцю можна чакаць, што шырока распаўсюджаныя ў нас праграмы і бібліятэкі будзе немагчыма выкарыстоўваць, альбо будуць даступныя толькі больш раннія версіі.

Прыемным сюрпрызам стаў узровень агульнаматэматычнай падрыхтоўкі кітайскіх студэнтаў. Трывалы падмурак ведаў па элементарнай матэматыцы не выклікае цяжкасцей у лікавых разліках без выкарыстання калькулятара.

Атэстацыя студэнтаў па навучальных дысцыплінах праводзіцца ў форме офлайн тэставання. Асаблівасцю сістэмы тэставання, прынятай у Кітаі, з'яўляецца абавязковая наяўнасць у тэставым заданні як мінімум пяці розных тыпаў пытанняў: адзіночны выбар, множны выбар, супастаўленне, паслядоўнасць, вырашэнне задач з указаннем адказу. Пры праверцы адказаў налічваюцца балы за няпоўнае рашэнне з улікам наяўнасці формул, матэматычных разлікаў і наяўнасці дакладнага адказу. Выніковая ацэнка па

прадмеце разлічваецца з выкарыстаннем каафіцыентаў на аснове адзнак па практычных і лабараторных занятках і ацэнкі па пісьмовым тэсце. У КНР выкарыстоўваецца 100-бальная сістэма адзнак.

Падчас стажыроўкі прайшоў сімпозіум з кіраўніцтвам універсітэта і выкладчыкамі фізічнага факутэта, а таксама – сустрэчы са студэнтамі праграмы, падчас якіх адбылася прэзентацыя ГДУ імя Ф. Скарыны (малюнак 2).







Малюнак 2 – Прэзентацыі ГДУ імя Ф. Скарыны ва ўніверсітэце Хэцзэ падчас сімпозіума з кіраўніцтвам універсітэта і сустрэч са студэнтамі-ўдзельнікамі сумеснай адукацыйнай праграмы

**Літаратура**

1. Совместная образовательная программа с Хэцзэским университетом. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://gsu.by/ru/node/5495. – Дата доступу: 30.01.2024.

2. Беларусь и Китай укрепляют позиции высшего образования. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://gsu.by/ru/node/5589. – Дата доступу: 30.01.2024.
3. Впечатлениями о стажировке в Китае делятся гомельские преподаватели. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://gp.by/novosti/obrazovanie/news280976.html. – Дата доступу: 30.01.2024.
4. Персонально. Выпуск 16 [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=tXHC74ZnLk0. – Дата доступу: 30.01.2024

***УДК 378.147:811.111-057.875-054.68***
***І. А. Бажок***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ НАПІСАННЮ ЭСЭ НА ЗАНЯТКАХ ПА АНГЛІЙСКАЙ МОВЕ ДЛЯ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ

Значная колькасць замежных студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў беларускіх вышэйшых навучальных установах, вывучаюць англійскую мову для будучай прафесіі настаўніка і перакладчыка. Самай запатрабаванай у Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны ў студэнтаў з Туркменістана з’яўляецца спецыяльнасць “Філалагічная адукацыя. Руская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)”. У сувязі з гэтым надзвычай актуальным стала пытанне асаблівасцей методыкі навучання замежных студэнтаў англійскай мове. Адукацыйнай праграмай прадугледжана вывучэнне мовы з перадпарогавага ўзроўню, аднак варта адзначыць, што большасць туркменскіх студэнтаў маюць цяжкасці ў выкарыстанні не толькі англійскай, але і рускай мовы. Таму працэс навучання і для студэнтаў, і для выкладчыкаў ускладнены.

Мэта вучэбных дысцыплін “Замежная мова (англійская)” і “Практыкум па замежнай мове (англійскай)” – фарміраванне асобы, якая здольная выкарыстоўваць англійскую мову ў прафесійнай дзейнасці і ажыццяўляць міжкультурную камунікацыю. Адной з важных задач на занятках па англійскай мове з’яўяляецца развіццё ў студэнтаў розных відаў моўнай дзейнасці. Студэнт, які атрымлівае вышэйшую адукацыю, павінен (акрамя падрыхтоўкі пісьмовых і вусных паведамленняў) быць здольным выказаць уласную думку, падмацаваную філасофскімі развагамі, аналітычнымі доказамі, павінен рабіць грунтоўныя высновы. Заняткі па англійскай мове заснаваныя на працы з рознымі тэматычнымі блокамі – ад пабытавых да глабальных (“Technology and Safety” (“Тэхналогіі і бяспека”), “Earth is Dearer than Gold” (“Зямля даражэйшая за золата”), “Human Personality and Life Events” (“Жыццё чалавека”), “Mass Media” (“СМІ”) і да т. п.). Напісанне эсэ дома і на занятках дазваляе найлепшым чынам вызначыць узровень сфарміраванасці ў студэнтаў лінгвістычнай і камунікатыўнай кампетэнцый, здольнасці да самастойнай творчай дзейнасці. Эсэ як празаічнаму жанру ўласцівыя парадаксальнасць, суб’ектыўнасць, эмацыянальнасць, рэфлексійнасць, адсутнасць дыдактызму. Таму менавіта гэтая форма з’яўляецца найбольш дзейснай і важнай у працэсе выкладання англійскай мовы.

Па прычыне таго, што студэнты ў межах адной вучэбнай групы маюць розны ўзровень валодання мовай, найбольш эфектыўным з’яўляецца рознаўзроўневае навучанне. З практычнага боку, відавочным з’яўляецца і той факт, што студэнты часам маюць неаднолькавы ўзровень валодання рознымі відамі дзейнасці (адзін – граматычна правільна піша, другі – дэманструе неблагое вуснае маўленне, трэці – можа добра напісаць аўдзіраванне). Праблема методыкі навучання ў рознаўзроўневых групах – актуальная для адукацыйнага працэсу. Цікавыя прапановы ў галіне выкладання замежнай мовы выказалі даследчыкі А. Класен і В. Адэгава ў артыкуле “Рознаўзроўневае навучанне англійскай мове ў вышэйшай школе”, надаючы вялікую ўвагу “разнастайным спосабам групіроўкі і эфектыўнаму